4. *Дожына, Н.І.* Пеўчыя рукапісы веткаўскіх стараевераў / Беларуская музыка ў люстэрку навуковых даследаванняў: матэрыялы навук. канф. (Нясвіж, 16 мая 2008 г.) – Нясвіж, 2008. – С. 24–30; Дожына, Н.І. Традыцыі веткаўскага сагласа: з гісторыі рукапіснай культуры стараевераў / Н.І. Дожына // Роднае слова. – 2003. – № 10. – С. 91–93; Дожина, Н.И. Рукописная культура и певческие традиции старообрядчества в Беларуси / Н.И. Дожина // Весці Бел. дзярж. акадэміі музыкі. – 2003. – № 4. – С. 41–46; Лявонцева, С. Мастацкае афармленне веткаўскіх рукапісных кніг XVIII стагоддзя / С. Лявонцева // Беларускі гіст. часоп. – 2007. – № 4. – С. 22–31;

5. *Дожина Н.И.* Певческая книга Октоих старообрядческой ветковской традиции: дис. ... канд. искусствоведения. – Минск : БГАМ, 2006. Леонтьева С.И. Искусство рукописной книги Ветки XVIII-начала XX века: : дис. ... канд. искусствоведения. – Минск БГАИ, 2009.

6. *Панченко, Ф.* Некоторые вопросы атрибуции певческих рукописей поморской традиции / Мир старообрядчества: материалы Междунар. научн. конф. / Ф. Панченко. – Вып. 4. – М., 1999. – С. 397–403.

7. *Смоленский, Ст.В.* О древнерусских певческих нотациях. Историко-палеографический очерк / Ст.В. Смоленский // СПб. : Изд. ОЛДП, 1901, Т. CXIV.

8. *«Судьба старой* книги»: документальный телефильм студии «Беларусьфильм». Реж. М. Жукова. – Минск , 2012.

# СУЧАСНАЯ АРХІТЭКТУРА БЕЛАРУСІ: ПРАБЛЕМА ЗАХАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АДМЕТНАСЦІ

**Захарына Ю.Ю.**

*кандыдат мастацтвазнаўства, загадчык кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка» (Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Ва ўмовах глабалізацыі мастацка-вобразнай сістэмы постіндустрыяльнай эпохі нацыянальны каларыт архітэктуры паступова страчвае гістарычную пераемнасць. Умацаванне пазіцый масавай культуры, у многім прадвызначанае інфарматызацыяй сучаснай цывілізацыі і тэхнізацыяй культурнай прасторы, паступова вядзе да распаўсюджання ў мастацкім асяроддзі новамодных павеваў, мастацка-вобразных штампаў, якія бессвядома прымаюцца грамадствам за эталоны прыгажосці. У сусветнай архітэктурна-будаўнічай практыцы адзначаецца мастацка-вобразная канвергенцыя. У склаўшайся сітуацыі дэфініцыя гістарычных рыс сучаснай архітэктуры Беларусі дазваляе раскрыць яе нацыянальную мастацка-вобразную адметнасць, што выступае адным з паказчыкаў суверэннасці дзяржавы.

Сучасная архітэктура Беларусі разнастайная па сваіх функцыянальна-тэхнічных і мастацка-эстэтычных прыкметах, сфарміраваных ва ўмовах інтэграцыі набыткаў тэхнагеннай цывілізацыі сусветнага маштабу. Варыятыўнасць мастацкіх вобразаў сучаснай архітэктуры рэспублікі, што вызначае яе адметнасць, з'явілася вынікам сімбіёзу традыцыйных і інавацыйных падыходаў да архітэктурна-праектыровачнай, будаўнічай і дызайнерскай дзейнасці, якія адпавядаюць патрабаванням грамадства. Сфарміраваная сацыякультурная сітуацыя стварыла ўмовы ўсталявання і трансфармацыі мастацка-вобразнай сістэмы архітэктуры, заснаванай

на суіснаванні бінарных полюсных пачаткаў, увасобленых у мастацкіх ідэях, мастацкіх задумах, мастацкіх вобразах: нацыянальнага і інтэрнацыянальнага, традыцыйнага і авангарднага, рацыянальнага і ірацыянальнага, статычнага і дынамічнага, што здолелі адлюстраваць дыялог гістарычна сфарміраванай і сучаснай культур.

Архітэктурна-праектыровачная дзейнасць XXI ст. уяўляе мэтанакіраваны працэс мадэрнізацыі асяроддзя пражывання, у аснове якога ляжыць комплексны падыход да вырашэння надзённых і стратэгічных сацыяльных праблем, звязаных са стварэннем камфортных умоў жыццядзейнасці чалавека і грамадства, эканамічнасцю будаўніцтва і эксплуатацыі аб'ектаў архітэктуры, іх экалагічнасцю, што ажыццяўляецца за кошт рацыянальнага прыцягненне прыродных, матэрыяльна-тэхнічных і інтэлектуальных рэсурсаў. Каштоўнасць ландшафту, гістарычных пабудоў, сфарміраваных у ходзе эвалюцыі рэгіянальных традыцый прадугледжваюць асяроддзевы падыход да праектавання і будаўніцтва. Ігнарыраванне прынцыпа ўніверсальнай цэласнасці асяроддзя прыводзіць да адсутнасці архітэктурных ансамблей, што вызначаюць адметнасць аблічча населенага месца. На жаль, асобныя маштабныя праекты, якія інвесціруюцца замежнымі кампаніямі, распрацоўваюцца без уліку нацыянальных асаблівасцей архітэктуры, прыўносячы дысананс паміж гістарычным і сучасным. Дыскрэтны характар пазіцыяніравання мастацкіх вобразаў архітэктуры, абумоўлены адсутнасцю выразных архітэктурных ансамблей, грэбаванне мастацка-эстэтычнымі суадносінамі гістарычнай і новай забудовы ва ўмовах асяроддзя са сцвярджэннем прыярытэту апошніх вядзе да разбурэння цэласнасці мастацка-вобразнай сістэмы з паступовым страчваннем нацыянальнага аблічча архітэктуры.

У эпоху імклівага развіцця прамысловасці, росту індустрыі, узрастаючай ролі інфармацыйных тэхналогій ва ўсіх галінах навукі адзначаецца ўзмацненне ўплыву касмапалітызу ў сусветнай культурнай прасторы. Уніфікацыя і валідацыя стандартаў архітэктурна-праектыровачнай дзейнасці, прывядзенне іх да адзіных нарматыўных ўзораў, павышэнне патрабаванняў да вырашэння кантрэтных задач не толькі ў працэсе рэалізацыі мастацкіх задум, але і на ступені распрацоўкі праектаў ва ўмовах канкурэнтаздольнасці вядзе да функцыянальнай дыстрыбуцыі выканаўцаў (архітэктараў, інжэнераў, праектыроўшчыкаў, дызайнераў) і як вынік – да дэструкцыі склаўшайся стагоддзямі нацыянальнай адметнасці архітэктуры. Відавочнай з'явай становіцца сціранне граней паміж рэгіянальным і сусветным. Як слушна адзначае архітэктар Р. Меер, "мы ўсе зараз жывем ва ўмовах глабальнай сусветнай культуры. Рэгіянальныя культурныя адрозненні краін ужо не адыгрываюць такой вялікай ролі, як у мінулым" [6, с. 114]. Прычынай гэтаму з'явілася ўцягненне набыткаў нацыянальных культур у агульную цывілізацыйную сістэму, што вызначыла інтэрнацыянальны характар сучаснай архітэктуры і культуры ў цэлым. Гэтую ж думку падкрэслівае беларускі

дойлід М. Гаўхфельд, які сцвярджае, што адной з праблем сучаснага дойлідства стала тое, што "...гарады губляюць архітэктурнае аблічча і адметнасць" [3, с. 24].

Глабалізацыя сучаснай культуры стала вызначальным фактарам развіцця і ўмацавання міжкультурных камунікацый. Стварэнне адзінай культурнай прасторы спрыяла ўцягненню рэгіянальных мастацкіх каштоўнасцей у сусветны кантэкст. Ва ўмовах трансфармацыі каштоўнасных арыенціраў, што пацягнула за сабою мастацка-вобразныя мадуляцыі, вызначэнне перспектыўных напрамкаў архітэктурна-будаўнічай практыкі (будаўніцтва цэнтраў культуры, бібліятэк, музеяў, спартыўных комплексаў, аб'ектаў камунікацыі) стала сведчаннем імкнення захаваць культурную спадчыну, развіцця наватарскіх канструкцыйна-тэхнічных і вобразных ідэй. Аднак уцягненне ў сусветную культурную прастору сучасных арыгінальных архітэктурных вобразаў, што сталі ўзорамі для пераймання, спрыяла рэтрансляцыі і ўзмацаванню пазіцый масавай культуры.

Эстэтыка мастацтва сучаснай эпохі прывяла да разбурэння культурных каштоўнасцей, склаўшыхся гістарычна, і да сцвярджэння новых, заснаваных на "тэхніцызме" сучаснай эпохі. Выхадам з падобнай сітуацыі, на думку многіх тэарэтыкаў, з'яўляецца апора на нацыянальныя традыцыі [2; 4; 5; 8]. Глыбокае і ўсебаковае асэнсаванне традыцый можа даць ключ да стварэння адпаведных часу архітэктурных тэорый, крэатыўных мастацкіх ідэй, на падставе якіх можа быць народжана новая архітэктура [7, с. 45]. Такую ж думку сцвярджае В. Аладаў, які лічыць, што "высокая архітэктура ствараецца толькі ў тым выпадку, калі яна абапіраецца на нацыянальную культуру ў спалучэнні з перадавой навукай і тэхналогіяй" [1, с. 21].

Мастацкія вобразы сучаснай архітэктуры зведалі ўплыў гістарызму – адной з асноўных плыней постмадэрна. Гістарызм постмадэрна прадвызначыў шматмоўе архітэктуры, якое атрымала выражэнне ў разнастайных праявах – кампраміснай, эклектычнай, кітчу. Кампрамісная лінія гістарызму, што знайшла ўвасобленне ў пераўтварэнні аблічча сучасных гарадоў Беларусі (шляхам аднаўлення страчаных архітэктурных помнікаў у гістарычных цэнтрах і пераўладкавання апошніх у пешаходныя зоны, уключэння элементаў ландшафту ў планіровачную структуру гарадоў у якасці галоўных кампазіцыйных восей і рэкрэацыйных зон з падкрэсленнем яго спецыфікі), культавым дойлідстве (пры ўвасабленні пошукаў сучаснай інтэрпрэтацыі гістарычных рыс сакральных пабудоў, вызначаных візантыйскім канонам, традыцыямі архітэктурных школ рускага царкоўнага дойлідства XII–XVII стст. розных рэгіёнаў, заходнееўрапейскімі гатычнымі традыцыямі, мясцовай культурай будаўніцтва хрысціянскіх храмаў), архітэктуры грамадскіх і жылых будынкаў (на аснове інтэрпрэтацыі характару вобраза пабудовы і архітэктурных элементаў, уласцівых раманскаму абарончаму дойлідству, пабудовам барока, класіцызму, мадэрна), дазволіла гарманізаваць

гістарычна сфарміраванае архітэктурнае асяроддзе і сучаснае пры захаванні нацыянальнай адметнасці беларускай архітэктуры. Эклектызм, які праявіўся ў стылявой міксацыі, закрануў найбольш яскрава жыллёвае дойлідства. Разнавіднасцю эклектычнай плыні ў сучаснай архітэктуры стаў "дакументальны гістарызм", заснаваны на цытаванні элементаў архітэктурнай кампазіцыі гістарычнага архетыпу. Развіццё эклектычнай тэндэнцый прывяло да кітчу, праявы якога яскрава абазначыліся ў архітэктуры Беларусі ў пачатку 2010-х гг. Кантаменацыі гістарычнага і сучаснага ў архітэктуры дазволілі ва ўмовах бесперапыннага пераўтварэння аблічча гарадоў і пасёлкаў у адпаведнасці з патрабаваннямі часу захаваць яе нацыянальнае аблічча.

Тыпалогія запатрабаваных соцыумам збудаванняў, павелічэнне маштабу забудовы, выкарыстанне апрабіраваных кампазіцыйных прыёмаў гарманізацыі асяроддзя, трактоўка архітэктурнай прасторы, мастацка-стылявая, фармальная, канструкцыйная варыятыўнасць вызначаюць агульныя тэндэнцыі ў развіцці сусветнага дойлідства. У той жа час архітэктура кожнай краіны захоўвае нацыянальнае аблічча, што складваецца пад уплывам прыродна-кліматычных і ландшафтных умоў, будаўнічых традыцый, гістарычна прадвызначанай функцыянальнай значнасці населенага месца ў маштабе краіны, рэгіёна, кантынента, спецыфікі жыццядзейнасці, светапогляду і менталітэту грамадства. Нацыянальную своеасаблівасць сучаснай архітэктуры Беларусі выяўляюць:

- сфарміраваны ў ходзе эвалюцыі і пераўтвораны ў адпаведнасці з існуючымі прыроднымі ўмовамі мяккі, спакойны ландшафт з наяўнасцю лесапаркавых зон і вадаёмаў, што не мае значных перападаў рэльефу, які выступае асновай асяроддзевага падыходу да архітэктурна-праектыровачнай і будаўнічай дзейнасці, падкрэслівае характар забудовы, з'яўляецца актыўным сродкам мадэліравання аблічча гарадоў, пасёлкаў, аграгарадкоў, спрыяе раскрыццю мастацка-эстэтычных якасцей архітэктуры;
- архітэктурныя формы, якія адсылаюць да гістарычных архетыпаў, што сузіраюцца і прачытваюцца рэцыпіентам у кантэксце асяроддзя, выклікаючы ў яго асацыяцыі са значнымі падзеямі, з'явамі, фактамі, якія характарызуюць спецыфіку нацыянальнай культуры;
- рэтраспектыўная стылізацыя забудовы і рэнавацыя помнікаў архітэктуры, якія гістарычна адыгрывалі важнае горадабудаўнічае значэнне ў планіроўцы населеных месц (ратушы, храмы, гасцініцы і інш.);
- сучасныя сакральныя збудаванні ў гарадах і пасёлках, у вобразах якіх узнаўляюцца рысы, уласцівыя вядучым архітэктурным школам культавага дойлідства, што мелі распаўсюджанне на тэрыторыі Беларусі ў папярэднія эпохі;
- малыя архітэктурныя формы і ландшафтныя дызайнерскія кампазіцыі ў аздабленні незабудаваных тэрыторый населеных месц, што імітуюць прадметы і аб'екты народнага быту, элементы мясцовай флоры і фауны;

- творы манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на гістарычную тэматыку, з вобразамі дзеячоў культуры беларускай зямлі, што дадаюць архітэктурнае асяроддзе выразнымі акцэнтамі.

1. *Аладов, В.Н.* Состояние и перспективы развития архитектуры жнлых зданий / В.Н. Аладов // Научно-информационный вестник БААРХ. – Вып. 1. – Минск: УП "Технопринт", 2003. – С. 19–21.

2. *Беккер, А.Ю.* Современная городская среда и архитектурное наследие / А.Ю. Беккер, А.С. Щеиков // ЦНИИ теории и архитектуры ; под ред. А.Ю. Беккера. – М. : Стройнздат, 1986. – 200 с.

3. *Гаухфельд, М.* Проблемы международного сотрудничества в области проектирования / Михаил Гаухфельд // Архитектура и строительство. – 2011. – № 4. – С. 22–25.

4. *Иконников, А.В.* Искусство, среда, время : Эстетическая организация городской среды / А.В. Иконников. – М. : Советский художнк, 1985. – 334 с.

5. *Кузьмичев, С.Д.* К вопросу о тенденцнях в сегодняшней белорусской архитектуре / С.Д. Кузьмичев // Архитектура и строительство. – 1995. – № 2–3. – С. 33–36.

6. *Новейшая архитектура* / гл. ред. Ф. Ходидьо, пер. с англ. А.М. Ведюшкина. – М. : АСТ: Астрель, 2008. – 192 с.: ил.

7. *Реза, А.* Традиционная архитектура Ирана и современность / А. Реза // Научно-информационный вестник БААРХ. – 2003. – Вып. 1. – С. 44–45.

8. *Рябушкин, А.В.* Творческие противоречия в новейшей архитектуре Запада / А.В. Рябушкии, А.Н. Шукурова ; ЦНИИ историн и теории архитектуры. – М. : Стройиздат, 1986. – 271 с.

## СОВРЕМЕННАЯ ННТЕРПРЕТАЦНЯ ТЕКСТА МУЗЕЙНОЙ ЭКСПОЗИЦИИ

**Краснова Е.Л.**

*кандидат культурологии, преподаватель кафедры истории Беларуси и музееведения*

*УО «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

*(Республика Беларусь, г. Минск)*

Еше в 1930-е годы многие исследователи активно развивали идею существования уннверсального языка музейной экспозиции, который помогал пониманню экспозиционного коитекста. Многое было сделано н достигнуто, однако постепеино разработки в данном направлеиии приостановились, поскольку набиравшие силу методы советского музейного проектирования исключали необходимость какой-либо художественной подачи материала. Любая экспозиция строилась на основе научно-систематической организации пространства, не придавая должного значения образно-художествениому решению экспозиции в целом. Так идея разработки некой лннгвистической основы экспозиции былн отложены на дальнне полки, ждать подходяшего времени.

Начиная с 1970-х гг.исследователи вновь обратились к возрождению нден разработки особого «языка» экспозицин, способного отличаться от всех других средств трансляции информации. Все больше и больше музееведов, экспозиционеров рассматривали разлнчные аспекты этого